ЗВЯЗДА

21 лістапада 2024 года

# «Вельмі шмат залежыць ад маладых спецыялістаў, якія павінны падставіць плячо дзяржаве»

**Старшыня Палаты прадстаўнікоў Ігар Сергяенка сустрэўся са студэнтамі Беларускага дзяржаўнага аграрнага тэхнічнага ўніверсітэта. Мерапрыемства не толькі знакавае, але і сімвалічнае. Гэтай сустрэчай дадзены старт інфармацыйна-асветніцкага праекта «Моладзь для Беларусі!».**




Ігар Сергяенка таксама павіншаваў БДАТУ з 70-годдзем стварэння. Ён адзначыў, што гэтая ВНУ з'яўляецца флагманам падрыхтоўкі кадраў для стратэгічна важнай сферы эканомікі і дзейнасць яго выпускнікоў непасрэдна звязана з забеспячэннем нацыянальнай бяспекі.

«Вельмі шмат сёння залежыць ад маладых спецыялістаў, якія сваімі ініцыятывамі, крэатыўнымі ідэямі і прапановамі, актыўнай добрасумленнай працай павінны падставіць плячо дзяржаве, годна прадоўжыць дзяржаўны курс на будаўніцтва моцнай і незалежнай Беларусі», — падкрэсліў Старшыня Палаты прадстаўнікоў. У сваім выступленні ён таксама закрануў тэму прэзідэнцкай выбарчай

кампаніі, якая стартавала ў краіне, і адзначыў ролю дзеючага Кіраўніка дзяржавы як нацыянальнага лідара ў стварэнні мадэлі беларускай дзяржаўнасці, арыентаванай на чалавека.



Праект «Моладзь для Беларусі» накіраваны на студэнтаў, лідараў маладзёжных грамадскіх арганізацый і першакурснікаў. У рамках праекта запланаваны сустрэчы дэпутатаў і членаў Маладзёжнага парламента са студэнтамі ўсіх факультэтаў ВНУ краіны. Агульная тэма для абмеркавання — дасягненні Беларусі за апошнія 30 гадоў і перспектывы далейшага развіцця краіны з улікам палажэнняў перадвыбарнай праграмы Прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнкі. Ігар Сергяенка ў рамках праекта прапанаваў абмеркаваць умовы, створаныя ў Беларусі для самарэалізацыі маладога пакалення, а таксама перспектывы стварэння дадатковых сацыяльных ліфтаў і новых форм дыялогу ўлады і моладзі. Як адзначыў Ігар Сергяенка, меркаванне студэнтаў важнае і пры абмеркаванні пытання аб пашырэнні форм падтрымкі сацыяльна значных маладзёжных ініцыятыў.

Сёння гэтыя ідэі рэалізоўваюцца ў рамках дзейнасці Савета спецыяльнага фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па сацыяльнай падтрымцы адораных навучэнцаў і студэнтаў, дзейнасці БРСМ, Савета маладых вучоных пры Міністэрстве адукацыі, універсітэцкіх і Нацыянальнага дзіцячага тэхнапаркаў, сістэмы адкрытых конкурсаў і выдзялення грантаў на рэалізацыю маладзёжных праектаў і інш.



У дыялогавых пляцоўках праекта «Моладзь для Беларусі» будуць удзельнічаць вядомыя беларусы, якія дасягнулі выдатных поспехаў у розных прафесійных сферах, маюць багаты кіраўніцкі, дзяржаўны, навуковы, вытворчы вопыт. Прамежкавае падвядзенне вынікаў праекта намечана на 20 студзеня 2025 года ў Авальнай зале.

**Паводле прэс-службы**
**Палаты прадстаўнікоў.**